СМЕЛА І БАДЗЕРА—НАПЕРАД!

Прамова т. А. Г. ЧАРВЯКОВА НА СУСТРЭЧЫ З ЛЕПШЫМІ БРЫГАДЗІРАМІ КОМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЕЖНЫХ БРЫГАД ВІЦЕБСКА*)

— Вашы расказы аб рабоце сваіх прадпрыемстваў і комсамольска-маладзёжных брыгад яскрава сведчаць аб тым, што ў Віцебску барацьба за права падпісання рапарту ўсебеларускаму з'езду саветаў была разгорнута шырока і што, несумненна, вашы брыгады заваявалі гэта права.

Да з'езда гэтага года мы прыйшлі з аграмаднымі поспехамі. Перад намі — зусім новая Беларусь, якая рэзка адрозніваецца ад Беларусі, што была да Кастрычніцкай рэволюцыі.

Тав. Чарвякоў надзвычайна пад'ёмна і ўсебакова ахарактарызаваўшы рост сацыялістычнай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і дасягненні нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР, пераходзіць да асобных гарадоў.

Возьміце Віцебск. Гэта быў маленькі, брудны гарадок. Яго ўскраіна — Маркаўшчына была аплотам паўпрыгонных, рассаднікам рэлігійнага дурману.

Цяпер Маркаўшчына, якая пераіменавана ў Пролетарскую слабаду, змяніла сваё аблічча. Тут знаходзяцца буйнейшыя прадпрыемствы горада і Беларусі. Гэта — вялікі сацыялістычны пасёлак, якім ёсць тысячы вельмі добрых рабочых кватэр, школы, яслі, ж-аператывы, трамвай.

Альбо возьмем Менск. Зусім не пазнаць яго. У мінулым ён быў звычайным губернскім брудным гарадком, які адрозніваўся ад другіх гарадоў асабліва жорсткімі нечалавечымі здзекамі над яўрэйскім насельніцтвам, паколькі горад уваходзіў у «черту аседлости».

Цяпер наш Менск — **вялікі пролетарскі горад**, адна з сямі сталіц Совецкага Саюза.

Усё гэта дае нам права сказаць, што мы сустракаем з'езд саветаў стварэннем новай Совецкай Беларусі.

Самае выдатнае ў гэтым працэсе — **стварэнне новага чалавека, упэўненага ў перамозе сацыялістычнага ладу, з энтузіязмам змагаючагася за гэты лад.**

І гэта мы бачым з вашага расказу пра завод «Чырвоны металіст», дзе старыя рабочыя перадаюць свае веды, вопыт, рэволюцыйную закалку моладзі, прышчаюць ёй сваю адданасць справе рэволюцыі.

Мне радасна слухаць, як комсамолка **Соскер** заявіла сёння, што яна гаспадарыцца работніцай Якімавай, якую ёй удалося перавыхаваць у адну з лепшых ударніц.

У новым чалавеку няма ні кроплі недавер'я ў свае сілы, ні кроплі адчаю, беспрасветнасці.

Гэты новы чалавек — жыццёрадасны, горды, адважны, які верыць у перамогу сацыялізма для якога ён працуе, жыве. Ён разумее, што перамагчы можна толькі ў жорсткай класавай барацьбе, перамагчы можна шляхам зўладання тэхнікай, культурай, навукай. Ён авалодвае імі. Ён разумее, што дабіцца сваёй мэты можна толькі шляхам утрымання граніцы на замку. І ён авалодвае ваеннымі ведамі, рыхтуецца да барацьбы з ворагам.

І таму самае каштоўнае для партыі, для рабочага класа, гэта тое, што расце выдатная сацыялістычная моладзь, у моцныя рукі якой пераходзіць справа сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, таварышы, трэба адзначыць, што было б няправільным сказаць, што намі ўжо ўсё зроблена. Чым больш мы робім, тым шырэй адкрываюцца перад намі далейшыя перспектывы.

Кожны з вас, аўладзеўшы тэхнікай, ведамі, не павінен гэтым абмяжоўвацца. Вы павінны работаць над сабой з усім разлікам, каб стаць самымі культурнымі, самымі развітымі людзьмі ў свеце.

Я жадаю завастрыць вашу ўвагу на тым, што ў сучасны момант разам з вялікімі перагонамі ў барацьбе за сацыялізм, на месца далейшае абвастрэнне класавай барацьбы.

Пераадолеўшы ворага, сацыялістычная будаўніцтва забяспечана выдатнымі дасягненнямі партыі і совецкай тэрыторыі тав. Сталіна.

Пасля разгрому ворагаў-троцкістскай антыпартыйнай групы, згубіўшыя ўсякую надзею на перамогу мас, самыя лютыя з сваёй нянавісці да партыі і сацыялістычнага будаўніцтва з самымі агалцелымі белагвардзейскімі элементамі і прыхвасцнічаюць інтэрвенцыяністкіх колаў суседніх буржуазных дзяржаў сталі на шлях адкрытага тэрору супроць правадыроў партыі і ўраду.

Гэта ўсё падрабуе ад нас аграмаднага пасілення класавай пільнасці. Трэба яшчэ больш узняць большэвіцкую пільнасць, умець распазнаваць затаёўшагася ворага, выкрываць і бязлітасна змагацца і знішчаць астаткі трацкісцка-зіноўеўскага ахвосця.

Далей тав. **Чарвякоў** пераходзіць да адказаў на запытанні брыгадзіраў.

Па першае ён адзначыў, як дадатны факт, што колькасць абранай моладзі ў Віцебскі горсавет з 6 проц. у мінулым годзе павысілася да 10 проц. у гэтым годзе.

На пытанне, якія задачы стаяць перад моладдзю ў саветах, тав. **Чарвякоў** адказаў:

— Такіяма, як і на вытворчасці моладзь у совеце павінна складаць ударную сталінскую брыгаду, перадавую па выкананню **усіх** рашэнняў партыі і ўраду па правядзенню ў жыццё намечаных мерапрыемстваў. Член горсовета на прадпрыемстве абавязан садзейнічаць правядзенню **усіх** мерапрыемстваў партыі і ўрада.

*) **Друкуецца па жывой запісі.**

ДРЭЗДЭНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі